Рэспубліканскі конкурс маладых талентаў

ЗОРКА ўзышла НАД БЕЛАРУССЮ

# Як над Беларуссю ўзыходзілі зоркі

**Існуе павер'е, што калі з неба падае зорка, то трэба загадаць жаданне, і яно абавязкова здзейсніцца. Ва усялякім разе, у гэта шчыра вераць рамантыкі ўсяго свету. Тыя ж, хто да ажыццяўлення сваіх запаветных мар ставіцца больш практычна і не мае звычкі залежаць ад непрадказальных прыродных з'яў, маглі дапамагчы сваім жаданням здзейсніцца падчас зусім не нябеснай з'явы — першага Рэспубліканскага конкурсу маладых талентаў "Зорка ўзышла над Беларуссю".**



З лістапада 2009 года ў конкурсе, заснаваным Міністэрствам культуры, абласнымі і Мінскім гарадскім выканкамамі сумесна з Міністэрствам інфармацыі і вядучымі тэлеканаламі краіны, узялі ўдзел 4200 чалавек ва ўзросце ад 16 да 31 года. Лепшым з іх выпаў гонар 7 мая выступіць на сцэне Беларускай дзяржаўнай філармоніі, падчас гала-канцэрта пераможцаў конкурсу, і на сцэне Палаца Рэспублікі, ва ўрачыстым сходзе, прысвечаным 65-ай гадавіне Перамогі, з удзелам Прэзідэнта Беларусі А.Р.Лукашэнкі.

У сваім звароце да лаўрэатаў конкурсу, якое зачытаў на сцэне Белдзяржфілармоніі міністр культуры Павел Латушка, Аляксандр Рыгоравіч павіншаваў усіх з паспяховым завяршэннем рэспубліканскага конкурсу "Зорка ўзышла над Беларуссю" і адзначыў, што ў нашай краіне вялікае значэнне надаецца выяўленню, развіццю і падтрымцы творчай моладзі. Палітыка дзяржавы накіравана на тое, каб адораныя прадстаўнікі новага пакалення раскрыліся як асобы, змаглі рэалізаваць свае ідэі, захавалі і прадоўжылі нацыянальныя культурныя традыцыі. Конкурс стаў адметнай з'явай у жыцці грамадства. На працягу некалькіх месяцаў навучэнцы, студэнты і маладыя дзеячы мастацтва з розных куткоў Рэспублікі спаборнічалі за званне лаўрэата конкурсу, знаходзілі сяброў і пашыралі свае творчыя гарызонты. Падчас конкурсу адкрыліся імёны, зоркі якіх хутка заззяюць на культурным небасхіле і папоўняць духоўную скарбонку краіны.

Галоўнай мэтай творчага спаборніцтва "Зорка ўзышла над Беларуссю" было знайсці і падтрымаць таленавітых маладых людзей, дапамагчы ім заявіць пра сябе і заняць годнае месца на творчым небасхіле. Шукалі таленты па ўсіх 118 раёнах рэспублікі, прапаноўвалі праявіць сябе творчым людзям у 12 намінацыях (аўтарская, народная і эстрадная песня, жывапіс і графіка, сучасны танец, дызайн, размоўны жанр, сацыяльная рэклама, фатаграфія і інш.), адбіралі лепшых у трох этапах конкурсу. Пачынаючы з другога этапу з канкурсантамі працавала рэспубліканскае журы (па кожнай намінацыі асобна), у склад якога ўваходзілі лепшыя прадстаўнікі сферы мастацтва, майстры, прызнаныя ў Беларусі і за яе межамі. Сярод іх — заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь Надзея Мікуліч, народны артыст Беларусі Міхаіл Фінберг, мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага народнага хору Рэспублікі Беларусь імя Г.Цітовіча Міхась Дрынеўскі, загадчык кафедры харэаграфіі Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў, лаўрэат Міжнароднага конкурсу сучаснай харэаграфіі Святлана Гуткоўская і іншыя.

— Конкурс "Зорка ўзышла над Беларуссю" — першы праект, які рэалізаваўся ў нашай краіне ў такім фармаце. Па некаторых намінацыях рэспубліканскі конкурс прайшоў упершыню. Для арганізатараў конкурсу яго правядзенне было вельмі важным вопытам, паколькі ў конкурсе прымалі ўдзел усе жадаючыя. Абмежаванні былі толькі ўзроставыя. Гэта быў і самы дэмакратычны конкурс, бо не было жорсткіх умоў па тэрмінах, і здаралася так, што калі нейкі канкурсант па нейкіх прычынах не змог ці не паспеў прыняць удзел у раённым і гарадскім адборачным туры, то яму давалі магчымасць прайсці адбор падчас абласнога адборачнага тура. Таму можна смела сцвярджаць, што ў конкурсе прынялі ўдзел сапраўды ўсе жадаючыя. Упэўнены, што маладых талентаў у нас у краіне значна больш, чым колькасць удзельнікаў, і ў другім конкурсе прымуць удзел усе тыя, хто ў гэты раз не рашыўся, — паведаміў Тадэвуш Іванавіч Стружэцкі, намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь.

У заключным этапе, што праходзіў у красавіку 2010 года ў Мінску і Маладзечне, прымалі ўдзел 594 чалавекі, прадстаўнікі ўсіх рэгіёнаў краіны. З іх 182 былі адзначаны граматамі журы, а 75 сталі лаўрэатамі. Найбольш фіналістаў (274 чалавекі) было ў намінацыі "Сучасны танец". Таксама трэба адзначыць намінацыі "Народныя спевы" (74 фіналісты) і "Эстрадныя спевы" (59 фіналістаў). Самымі малаколькаснымі былі намінацыі "Рэжысура масавых свят, тэатралізаваных прадстаўленняў, шоу-праграм" — 8 фіналістаў, "Сацыяльная рэклама"— 10 і "Скульптура" — 11 фіналістаў.

Асаблівасцю намінацый "Рэжысура масавых свят, тэатралізаваных прадстаўленняў і шоу-праграм" і "Сацыяльная рэклама" быў іх завочны характар. Згодна з рэгламентам конкурсу, сцэнары сваіх будучых імпрэз удзельнікі здавалі ў пісьмовым выглядзе журы, у склад якога ўвайшлі толькі найлепшыя практыкі і тэарэтыкі тэатральнага і тэлевізійнага мастацтва. На жаль, убачанае іх асабліва не ўразіла...

— З амаль 25 заявак, што мы атрымалі з усёй краіны, па-сапраўднаму не спадабалася ні адна, — дзеліцца думкамі старшыня журы конкурсу ў намінацыі "Сацыяльная рэклама", прафесар кафедры рэжысуры кіно і тэлебачання Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, рэжысёр і сцэнарыст Павел Іваноў. — Асноўная рыса ўсіх работ — адсутнасць свежых, нечаканых ідэй. Усе тэмы збольшага вядомыя. Ніякіх мастацкіх "азарэнняў" мы ў дасланых рукапісах не ўбачылі...

**(Заканчэнне на 13-й стар.)**

# Як над Беларуссю ўзыходзілі зоркі



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

З уражаннямі ад конкурсу Паўла Іванова ў многім салідарная галоўны рэжысёр Беларускай дзяржаўнай філармоніі Ніна Осіпава — старшыня журы ў намінацыі "Рэжысура масавых свят тэатралізаваных прадстаўленняў і шоу-праграм".

— На жаль, 95% сцэнарыяў, якія мы атрымалі, зусім не цікавыя, — кажа Ніна Осіпава. — Іх аўтары мысляць занадта стандартна, у работах пераважаюць шаблоны і стэрэатыпы. Ад моладзі мы чакалі больш яскравай фантазіі, а галоўнае, арыгінальных задумак...

Кажучы пра іншыя творчыя намінацыі, нельга не адзначыць "Фатаграфію". Яшчэ падчас праведзення першага і другога тураў работы ўдзельнікаў у гэтай намінацыі пакінулі ў журы станоўчыя ўражанні. Як падкрэсліла старшыня журы загадчык кафедры кінатэлеаператарскага майстэрства Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Настасся Суханава, вынік у цэлым журы задаволіў: у кожнага з канкурсантаў трэцяга тура творчы запал, своеасаблівы погляд на свет, яркая індывідуальнасць. Што да недахопаў, то галоўны сярод іх — адсутнасць спецыялізаванай адукацыі. Большасць работ была выканана на годным узроўні, некаторыя ўдзельнікі конкурсу падрыхтавалі цэлыя праекты. Прыемна здзівілі канкурсанты з рэгіёнаў. Галоўнай інтрыгай конкурсу стала "выпрабаванне" фотарэпартажам. Усяго некалькі гадзін было дадзена ўдзельнікам трэцяга тура, каб увасобіць у названым жанры тэму "Вясновы дзень у парку". Наступнай раніцай журы па выніках зробленай працы вынесла свой вердыкт. Гэтае заданне істотна змяніла карціну творчага спаборніцтва. Некаторыя лідары страцілі свае месцы, а наперад нечакана выйшлі іншыя канкурсанты.



Першае месца, літаральна на некалькі балаў абышоўшы сваіх калег, заваяваў студэнт Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, будучы кінатэлеаператар Аляксандр Тапчэеў. З аднаго боку, работам Аляксандра ўласцівы эксперымент, з другога — пераможца рэспубліканскага конкурсу аказаўся вялікім прыхільнікам здымак на плёнку.

— Плёнка, — кажа малады кінатэлеаператар, — прывучае да таго, што трэба з розумам раскладваць матэрыял, бо ёсць пэўны яго ліміт. Да гэтага далучаецца і майстэрства. Прыемна праяўляць свой негатыў, прыемна яго друкаваць, працаваць з кадрам. Сёння, бадай, кожны, хто набыў фотаапарат, лічыць сябе фатографам. Мне нецікава канкурыраваць з тымі, хто лічыць, нібы ўсё зробленае імі — гэта шэдэўр.

— Безумоўна, у ходзе конкурсу былі нейкія хібы. Сёння мы бачым, што трэба ўдасканальваць палажэнне конкурсу, яго трэба паглыбляць, больш дакладна адпрацоўваць. Таму што ўзнікалі некаторыя супярэчнасці, асабліва па шматлікіх намінацыях, напрыклад, па "Народных спевах", дзе была вялікая колькасць салістаў і вялікая колькасць ансамбляў. У журы была праблема: як адзначыць і салістаў асобна, і ансамблі, як падзяліць паміж імі месцы. Мы будзем дапрацоўваць разам са спецыялістамі, старшынямі журы палажэнне, каб наступны конкурс быў яшчэ больш арганізаваным, — дадаў Тадэвуш Іванавіч Стружэцкі. — Канечне, вынікі першага конкурсу будуць яшчэ неаднойчы аналізавацца. Будуць вельмі ўважліва вывучацца праблемы рэпертуару, якія якраз выявіліся падчас конкурсу. Па выніках аналізу мы распрацуем рэкамендацыі, якімі можна будзе карыстацца пры падрыхтоўцы наступнага конкурсу.

Акрамя шансу выступіць на вялікай сцэне і атрымаць грашовыя прэміі, у лаўрэатаў конкурсу ёсць магчымасць без творчых іспытаў быць залічанымі на адпаведныя спецыяльнасці творчых вышэйшых навучальных устаноў. Гэта асабліва важна для са-



праўды таленавітых маладых людзей, якім для поўнага раскрыцця свайго творчага патэнцыялу не хапае прафесійнай адукацыі, спецыялізаваных ведаў і сакрэтаў майстэрства. Больш за тое, пераможцы конкурсу ў розных намінацыях будуць прадстаўляць нашу краіну на міжнародных конкурсах. Напрыклад, ужо сёння з ліку пераможцаў конкурсу "Зорка ўзышла над Беларуссю" фарміруецца нацыянальная каманда для ўдзелу ў Дэльфійскіх гульнях, якія адбудуцца ў Арменіі. Канкурсантам прапаноўвалася таксама ўзяць удзел у адборачным туры на конкурс маладых выканаўцаў, які праходзіць падчас "Славянскага базару" ў Віцебску.

Рэспубліканскі конкурс талентаў "Зорка ўзышла над Беларуссю" стаў важнай падзеяй культурнага жыцця краіны. Дзякуючы яму, запалілася не адна зорка, а цэлае сузор'е тых, каму наканавана ў бліжэйшай будучыні стаць гордасцю айчыннага мастацтва і годна прадстаўляць нашу краіну на міжнароднай арэне.

**Марына ПЫРКОВА.**

НА ЗДЫМКАХ: пераможца ў намінацыі "Фатаграфія" Аляксандр Тапчэеў (1 стар.); міністр культуры Рэспублікі Беларусь Павел Латушка ўзнагароджвае пераможцаў у намінацыі "Сучасны танец" — ансамбль кафедры харэаграфіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў; дыпламант II ступені ў намінацыі "Сучасныя спевы" Аляксандр Сабалеўскі; уладальніца II ступені ў намінацыі "Аўтарская песня" Надзея Папкоўская.

**Фота Алега ІГНАТОВІЧА.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ